■ «Белая вежа» — 2017

# Зноў пра каханне?

## 8 верасня ў Брэсце пачынае работу міжнародны тэатральны фестываль

**Калі восень нагадвае пра сябе першымі халадамі і дажджамі, хочацца паглядзець добры тэатр. Ды каб пра каханне. А пра што яшчэ наогул можна зрабіць сапраўдную пастаноўку, каб яна зайграла, вылучылася на фоне разнастайнай праграмы тэатральнага фестывалю? Форум тэатраў — гэта заўсёды эксперыменты, шмат нечаканасцяў, балансаванне на мяжы... Не раўнуючы як паказ высокай моды: апрануць гэта часам немагчыма, а вось тэндэнцыю вызначыць — самы раз. Так і тут.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Але ад фестывалю пастаянны глядач чакае сапраўднага тэатра. Такога, каб да самых патаемных струн душы, каб да сэрца, да розуму дакранулася закладзенае ў падмурак рэжысёрам, каб выходзіў потым з залы і круцілася ў галаве: і я гэтак жа думаю, адчуваю, здагадваюся... Вось як, напрыклад, было са спектаклем «Фро» Рыжскага рускага тэатра імя Чэхава два гады таму. Ужо цэлыя два гады прайшло, а помніцца. Не, не сюжэт альбо паслядоўнасць дзеі. Помняцца ўражанні, эмоцыі, запал, які артысты змаглі перадаць гледачам. І ад душы пабіўшы далоні апладысментамі, пакінуўшы сцены тэатра, удыхнуўшы свежага паветра, хацелася жыць, любіць усіх блізкіх і верыць ва ўсёпераможнае каханне.

Добра, што рыжскі тэатр едзе да нас зноў. Яны вязуць сёлета пастаноўку «Альбом». Кажуць, што гэта першы з 1923 года зварот да тэкстаў Аркадзя Аверчанкі, які амаль сто гадоў таму чытаў свае апавяданні са сцэны рускага тэатра ў Рызе. Ну і пра каханне ў яго ёсць апавяданні, а таксама на тэму вечных пытанняў быцця.

Падчас прэс-канферэнцыі **дырэктар фестывалю Аляксандр КОЗАК** зазначыў, што большую частку праграмы фэсту складаюць драматычныя пастаноўкі, добра прадстаўлена і сучасная драматургія. Не можа не інтрыгаваць заяўленая работа Маскоўскага тэатра юнага гледача па апавяданні Чэхава «Скрыпка Ротшыльда». Бо ў гэтай пастаноўкі шмат узнагарод. Чаго вартыя «Залатыя маскі» за лепшы спектакль вялікай формы і лепшага мастака! У пастаноўцы бярэ ўдзел народны артыст Расіі Валерый Барынаў. А нашаму гледачу спектакль стаў даступны з прычыны дапамогі з фінансаваннем менавіта расійскага боку. Бо калі б на квітках пазначылі маскоўскія цэны, наўрад ці здагадацца, колькі гледачоў здолела б пайсці. Але ж намаганні арганізатараў вартыя выніку. Зноў жа, на думку меркавання дырэктара фестывалю, работу можна лічыць узорам тэатральнага мастацтва. Як кажуць, пажывём — пабачым.

Батумскі дзяржаўны драматычны тэатр імя І. Чаўчавадзэ падрыхтаваў спектакль «Сіндром, або Каго ўслаўляеш?», тэатр ФЕРТЬ (РТШ) з Эстоніі — работу «Боб ведае». Ровенскі абласны акадэмічны музычна-драматычны тэатр, які ў 2012 годзе паспяхова выступіў у нас з пастаноўкай «Калігула», гэтым разам прадстаўляе драму «Ненармальная». Гэты спектакль, дарэчы, пакажуць не толькі ў Брэсце, але і ў Жабінцы.

Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа» гэтага года 22-гі па ліку. У афішы заяўлены 28 тэатральных калектываў з 14 краін свету. Форум адкрываецца ў пятніцу вечарам фарсам-вадэвілем «Пінская шляхта», які пакажа Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Купалы. У гэты ж дзень гледачу будуць прадстаўлены яшчэ два спектаклі. Сваю работу «Сіняя-сіняя» пакажа Магілёўскі абласны тэатр лялек. І па даўняй традыцыі «Вежы» на плошчы Леніна адбудзецца вулічны спектакль «Высокія мары» тэатра з Чэхіі. Улюбёнец брэсцкай публікі Львоўскі тэатр «Уваскрэсенне» таксама пакажа плошчавую дзею, толькі 14 верасня, яна называецца «Цягнік са Львова».

Гэтым разам і пасля закрыцця фестывалю, у нядзелю, 17 верасня, заяўлены яшчэ адзін спектакль. Камедыю «ВДВ. Усім добры вечар!» з удзелам вядомага артыста тэатра і кіно Аляксандра Балуева пакажуць масквічы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# НЕ РАСКОША, А СРОДАК ПЕРАМЯШЧЭННЯ




## БАРАЦЬБА З РЭГІСТРАЦЫЯЙ

Пачаць трэба з таго, што ж уяўляе сабой каршэрынг. Гэты тэрмін абазначае від кароткатэрміновай арэнды аўтамабіля са штохвіліннай або пагадзіннай аплатай, якая звычайна выкарыстоўваецца для кароткіх гарадскіх паездак. Падобная паслуга надзвычай хутка набірае папулярнасць ва ўсім свеце, паколькі чалавеку ў такім выпадку неабавязкова купляць сваю машыну, а гэта — велізарная эканомія грашовых сродкаў. Сёння ў многіх гарадах Еўропы валодаць аўтамабілем дорага і не вельмі зручна, паколькі перавагай на дарогах паступова завалодалі веласіпедысты і грамадскі транспарт. Вось і атрымліваецца, што зручней скарыстацца камфортным аўтамабілем, заплаціць невялікую арэндную плату і адправіцца па сваіх справах, маючы магчымасць пакінуць машыну ў любым з пунктаў абслугоўвання. Але ці ёсць неабходнасць у такім сэрвісе ў Беларусі?

Каб зарэгістравацца ў сістэме, трэба спампаваць праграму на свой смартфон. Але гэта толькі пачатак, паколькі каб карыстацца такой незвычайнай паслугай, трэба прайсці нямала працэдур. Спачатку новаму карыстальніку неабходна адправіць пакет дакументаў праз праграму, а ўжо потым работнікі сэрвісу вызначаць, можаш ты скарыстацца каршэрынгам ці не. Працэс, калі шчыра, даволі доўгі і не вельмі камфортны.

Чаму? Таму што патэнцыйнаму карыстальніку трэба адправіць фатаграфіі вадзіцельскага пасведчання, талона да яго, а таксама здымкі некалькіх старонак пашпарта. У канцы трэба зрабіць сэлфі са сваімі правамі. Зразумела, што ўсё гэта неабходна для спакойнай работы сэрвісу, — усё ж такі, аўтамабіль каштуе немалых грошай. Аднак многіх карыстальнікаў такі запыт можа і адштурхнуць: не кожны гатовы падаць свае дакументы на агляд пакуль не вельмі вядомага сэрвісу.

Таксама перад адпраўкай дакументаў карыстальнік знаёміцца з афіцыйным дагаворам, які неабходна будзе падпісаць. У ім існуе раздзел, які можа адштурхнуць яшчэ частку магчымых кліентаў. У падпункце «Адказнасць бакоў» прапісаны варыянты магчымых штрафаў. Напрыклад: у выпадку адключэння або пашкоджання кліентам усталяванага ў аўтамабілі мабільнага тэрмінала кліент аплачвае арэндадаўцу штраф у памеры 4 500 рублёў. Або вось: пры завяршэнні арэнды і пакіданні аўтамабіля на тэрыторыі, у якую няма агульнага доступу, на тэрыторыі закрытай або спецыялізаванай стаянкі, на тэрыторыі, для доступу ў якую неабходны дазвол, а таксама пакіданне аўтамабіля з парушэннем правілаў паркоўкі, кліент аплачвае арэндадаўцу штраф у памеры 350 рублёў. Прызнаюся, калі я чытаў дагавор, з'явіліся думкі пра тое, што падпісваць дамову — не лепшая ідэя.

Тым не менш дакументы адпраўлены, з дагаворам карыстальнік азнаёмлены, цяпер неабходна адабрэнне ад сэрвісу. Дарэчы, каб атрымаць адабрэнне, кліенту павінна быць не менш за 21 год, а стаж кіравання павінен быць не менш за 1 год. Праз пяць дзён я атрымаў паведамленне, у якім было напісана, што мая кандыдатура ўхвалена і трэба прыехаць у салон мабільнага аператара, каб заключыць дагавор. Дарэчы, яшчэ адзін не вельмі камфортны момант: ужо літаральна праз гадзіну я быў у салоне сувязі, аднак у базе мая кандыдатура ўсё яшчэ не была ўхвалена. У аддзеле тэхнічнай падтрымкі мяне папрасілі пачакаць дзесяць хвілін, пасля чаго мае даныя сапраўды з'явіліся. Дагавор падпісаны, можна ехаць!

## ПАДЧАС КІРАВАННЯ

Калі здаецца, што нарэшце ўсё гатова і можна ездзіць, усплывае прадказальная праблема. Паколькі сэрвіс толькі пачаў сваю работу, наяўных аўтамабіляў у ім папросту мала. Да канца года можа з'явіцца 100 арэндных машын, аднак пакуль там каля 40 аўтамабіляў. Таму, калі ты не працуеш ці не жывеш у цэнтры сталіцы, то шанцаў, што вольны аўтамабіль будзе ад цябе за пяць хвілін хадзьбы, вельмі няшмат. Аднак мне пашанцавала: я ішоў па плошчы Незалежнасці, тады як сэрвіс знайшоў найбліжэйшую машыну на вуліцы Ленінградскай і тут жа мне паведаміў. пяць хвілін — і я за рулём.

Што ж за аўтамабілі прапануе сэрвіс? У большай ступені — гэта маленькі хэтчбэк Ravon 2, які з'яўляецца блізнём Chevrolet Spark. Менавіта ён мне і дастаўся. Таксама сустракаюцца Renault Sandero Stepway. Перад тым, як сесці ў свой аўтамабіль, абавязкова трэба яго агледзець на прадмет розных пашкоджанняў. Калі бачыце нейкае пашкоджанне — абавязкова фатаграфуйце, пасля чаго адпраўляйце ў тэхнічную падтрымку. Гэта вельмі важна, бо калі не паведаміць аб праблеме, штраф за драпіну на капоце можа прыляцець вам. Пасля агляду можна садзіцца ў аўтамабіль. Тут у чытачоў павінна паўстаць пытанне: а як адкрыць і завесці машыну? Усё проста: ключ ужо знаходзіцца ў запальванні, а адкрываецца аўтамабіль з кнопкі на смартфоне кліента.

Нездарма маленькія гарадскія хэтчбэкі карыстаюцца папулярнасцю ў Еўропе: каб перамяшчацца па горадзе і не клапаціцца аб паркоўцы, гэта ідэальны варыянт. Машына мне дасталася вёрткая і нечакана дынамічная: аўтаматычная каробка перадач працавала вельмі ўпэўнена і лёгка. Унутры месца не вельмі шмат, аднак для некалькіх чалавек і нядоўгай паездкі ў межах горада джып і не патрэбны. Адзіны мінус заключаецца ў тым, што на задніх бакавых шыбах аўтамабіля размешчана рэклама сэрвісу, што крыху перашкаджае пры выездзе з паркоўкі. Парктронікаў і камеры задняга віду ў аўтамабілі не было, а абмежаваны агляд з-за рэкламы на шкле сапраўды не спрыяў камфортнаму выезду з паркавальнага месца.

Але гэта дробязі: у цэлым, аўтамабіль вельмі прыемны ў кіраванні, абсталяваны такімі опцыямі, як кандыцыянер і Bluetooth. Трохі збянтэжыў расход паліва: дзіўна, але такая маленькая машына расходавала 10 літраў паліва на 100 кіламетраў! Але гэта не важна, бо кліент за паліва не плаціць. Дарэчы, пра наведванне запраўкі: аўтамабіль неабходна запраўляць, калі ўключыўся індыкатар нізкага ўзроўню паліва. Для гэтага трэба ўзяць паліўную карту ў бардачку, пін-код напісаны на карце. Пасля запраўкі трэба зрабіць фота чэка запраўкі на фоне прыборнай панэлі і даслаць у падтрымку. За кожную самастойную запраўку сэрвіс кампенсуе 15 бясплатных хвілін карыстання.

І нарэшце, самае галоўнае для любога кліента — гэта цэны. Існуе два тарыфы, якія можна абраць у пачатку паездкі, — хвілінны і сутачны. Хвіліна язды каштуе 29 капеек, хвіліна чакання — 6 капеек. У гэтага тарыфу ёсць ліміт — 70 кіламетраў, за кожны наступны кіламетр спісваецца 19 капеек. У сутачным тарыфе ўсё проста — за 24 гадзіны плаціш 99 рублёў. Ліміт — 200 кіламетраў, кожны наступны — 19 капеек. Я абраў хвілінны тарыф, і за шлях ад вуліцы Ленінградскай да рэдакцыі газеты на вуліцы Багдана Хмяльніцкага аддаў 7 рублёў 89 капеек. Так, нятанна, але ёсць нюанс: я карыстаўся сэрвісам упершыню, хвілін пяць сышло на знаёмства з аўтамабілем, наладжванне сядзення і люстэркаў, а яшчэ 7—8 хвілін пасля завяршэння паездкі сышло на пошук паркавальнага месца. Увогуле, укласціся можна было і за 20 хвілін, што каштавала б 5 рублёў 8 капеек. А вось гэты кошт ужо цалкам супастаўны з таксі.

## ЯКІ Ж ВЕРДЫКТ?

Каршэрынг — гэта сапраўды новы варыянт для перамяшчэння па сталіцы, таму высновы пра перспектывы сэрвісу рабіць пакуль рана. Зразумела адно: у жыхароў Мінска з'явілася яшчэ адна магчымасць для таго, каб камфортна ездзіць па горадзе. Дарэчы, пра камфорт: калі вы не вельмі ўпэўнена адчуваеце сябе за рулём, то лепш скарыстацца таксі ці іншым відам транспарту. З-за таго, што я ўпершыню вадзіў падобны аўтамабіль, адчуваў сябе не вельмі ўпэўнена. Таму я б параіў маладым кіроўцам не спяшацца адпраўляцца за руль, а перасесці на пасажырскае сядзенне таксі. А вось вопытныя вадзіцелі напэўна адчуюць станоўчыя эмоцыі ад кіравання новым аўтамабілем.

Калі казаць пра выгаду, то каршэрынг у большасці выпадкаў выйдзе даражэй іншых відаў транспарту. Але, зноў жа, усё залежыць ад сітуацыі: калі няма затораў, а ехаць недалёка і з паркоўкай пашанцуе, то тады, можа, атрымаецца і танней за таксі. Але гэта, хутчэй, ідэальны сцэнарый. Да таго ж, не трэба забываць аб адказнасці: кіроўца адчувае немалы стрэс.

Затое параўноўваць такі сэрвіс па выгадзе значна цікавей з асабістым аўтамабілем. Калі ў найбліжэйшы час колькасць такіх аўтамабіляў значна павялічыцца, то тады пра гэта можна задумацца. Урэшце, ва ўласнай машыне занадта шмат выдаткаў: гэта не толькі паліва, але і страхоўка, расходныя матэрыялы, тэхагляд, шыны... А каршэрынг дазваляе не думаць пра гэта. Калі вы выкарыстоўваеце такую праграму, вы плаціце толькі за час — усё астатняе ў адказнасці самога сэрвісу.

Каршэрынг пакуль нельга назваць канкурэнтам таксі — пра гэта можна казаць толькі ў тым выпадку, калі цэны на кароткатэрміновую арэнду будуць паніжаны. Таму пакуль такі сэрвіс можна лічыць толькі магчымай альтэрнатывай для ўласнага аўтамабіля, ды і тое з натяжкай: не кожны будзе штодня шукаць машыну (яна ж не будзе чакаць пад домам) і не кожны гатовы мірыцца з тым, што аўтамабілем карыстаецца нехта яшчэ.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)